and encyclopaedic articles presenting the contemporary bibliological thought in Poland. At the same time the Polish book culture is presented in context of the world book science. In whole the new "Encyclopedia of the book" is a real compendium of book culture knowledge.

## ГІСТОРЫЯ СУСВЕТНАЙ І АЙЧЫННАЙ БІБЛІЯГРАФІІ

***Саітава, В. І.*** **Бібліяграфазнаўства. Гісторыя** : вучэбны дапаможнік / В. І. Саітава, В. Е. Лявончыкаў, Т. В. Кузьмініч ; пад агул. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2017. – 248 с.

*У вучэбным дапаможніку «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» паказаны асноўныя перыяды эвалюцыі бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Адлюстравана арганізацыя вытворчасці бібліяграфічнай інфармацыі падчас кожнага з гэтых перыядаў, уклад выдатных дзеячаў і вядучых установаў, асноўныя крыніцы агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, якія складаюць яе залаты фонд, дасягненні ў распрацоўцы тэорыі бібліяграфіі і методыкі бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання.*

Бібліяграфія – старажытная і складаная грамадская з'ява, якая ўпарадкоўвае прастору фіксаваных ведаў (дакументаў, тэкстаў) з мэтай арыентацыі ў ёй спажыўцоў інфармацыі. На працягу тысячагоддзяў бібліяграфія забяспечвала падрыхтоўку, распаўсюджанне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі – аднаго з асноўных сродкаў задавальнення інфармацыйных патрэб прадстаўнікоў любых сацыяльных і прафесіянальных груп. Бібліяграфія цесна звязана з узроўнем адукацыі, навуковага і культурнага развіцця грамадства, абумоўлена сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі. Кожны гістарычны этап мае свае адметныя характарыстыкі ў арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці, ствараемай бібліяграфічнай прадукцыі, ступені пранікнення бібліяграфіі ў асобныя сферы грамадства, яе ўласнай адасобленасці і прафесіяналізацыі.

Асаблівасці развіцця бібліяграфіі і яе дасягненні даследуюцца ў самастойнай навуковай і вучэбнай дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя», а засваенне гісторыка-бібліяграфічных ведаў будучымі спецыялістамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці – неабходны этап у іх прафесіянальнай падрыхтоўцы. Гісторыка-бібліяграфічныя веды фарміруюць прафесійны кругагляд, эрудыцыю і гуманістычны светапогляд, з'яў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляюцца адной з асноўных крыніц фактычнага і метадалагічнага забеспячэння іншых частак бібліяграфазнаўства. Таму з'яўленне буйных публікацый па гісторыі бібліяграфіі заўсёды станавілася значнымі падзеямі галіновай навукі, адукацыі і практычнай дзейнасці.

Гісторыю бібліяграфіі ў свеце даследавалі вядомыя бібліяграфазнаўцы розных краін: Г. Шнэйдэр, М. М. Куфаеў, К. Р. Сімон, Л. Н. Мальклес, У. Бонсер, Л. Б. Грузінава, Б. А. Семяноўкер і інш. Гісторыю бібліяграфіі ў асобных краінах вывучалі: візантыйскую – Б. А. Семяноўкер, кітайскую – Яо Мін-да, літоўскую – В. Жукас, польскую – Ю. Корпала, рускую – М. В. Здобнаў і М. В. Машкова, украінскую – І. І. Карнейчык, французскую – Л. Н. Мальклес і інш.

Сусветная гісторыя, а таксама айчынная гісторыя бібліяграфіі ўваходзяць у лік вучэбных дысцыплін для падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў ва ўніверсітэтах і бібліятэчных школах у многіх краінах, у тым ліку ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Да нядаўняга часу гісторыя сусветнай і гісторыя беларускай бібліяграфіі выкладаліся як асобныя дысцыпліны і мелі самастойнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне, асновай якога былі падручнік В. Е. Лявончыкава «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» (1981, 1991), вучэбны дапаможнік В. І. Саітавай «Сусветная гісторыя бібліяграфіі (да сярэдзіны XX ст.)» (2005), электронныя тэксты лекцый Т. В. Кузьмініч і В. І. Саітавай «Гісторыя беларускай бібліяграфіі» (2007). Увядзенне інтэграванай вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» выклікала падрыхтоўку аднайменнага вучэбнага дапаможніка – першага нацыянальнага выдання, у якім разглядаецца ўзнікненне і эвалюцыя бібліяграфіі ў свеце і Беларусі з часоў старажытнасці да нашых дзён. Яго аўтары – вядомыя беларускія гісторыкі бібліяграфіі.

Даследчыкі сусветнай гісторыі бібліяграфіі вырашалі складаныя метадалагічныя пытанні, у тым ліку стварэнне перыядызацыі, падыходы да адбору бібліяграфічных фактаў і з'яў, на аснове якіх робяцца аналіз і абагульненне, размежаванне бібліяграфічных і небібліяграфічных фактаў і з'яў, якія разумеліся імі па-рознаму, і інш. Гэтыя пытанні з пазіцый сучаснага бібліяграфазнаўства знайшлі вырашэнне і ў вучэбным дапаможніку «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбны дапаможнік «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» істотна адрозніваецца ад ужо існуючых айчынных і замежных падобных выданняў па канцэптуальнай аснове. Гэта першы вопыт перыядызацыі, пабудаванай на падставе гістарычна пераважаючых носьбітаў фіксаваных ведаў, якія станавіліся асноўнымі аб'ектамі бібліяграфічнага адлюстравання. Змест вучэбнага матэрыялу структураваны ў трох асноўных раздзелах: «Бібліяграфія ў рукапісны перыяд развіцця тэкставых камунікацый (III тысячагоддзе да н. э. – XV ст.)», «Бібліяграфія ў перыяд кнігадрукавання як асноўнага сродку фіксавання і распаўсюджання інфармацыі (канец XV – сярэдзіна XX ст.)», «Бібліяграфія ў перыяд станаўлення і развіцця лічбавых камунікацый (канец XX – пачатак XXI ст.)». Такая перыядызацыя дазволіла акцэнтаваць увагу на гістарычнай змене аб'ектаў бібліяграфавання і надала ўжытай схеме галіновую спецыфіку. У межах асноўных раздзелаў матэрыял пададзены з улікам агульнай гістарычнай перыядызацыі сусветнай і беларускай гісторыі. Раздзелы і тэмы вылучаны лагічна і паслядоўна, такая ж ацэнка можа быць дадзена і выкладанню матэрыялу па тэмах.

Асноўная ўвага ў іх зместавым напаўненні надаецца эвалюцыі бібліяграфіі, узнікненню новых відаў бібліяграфічнай дзейнасці, тэндэнцыям развіцця агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, укладу выдатных бібліёграфаў і бібліяграфічных цэнтраў у арганізацыю, методыку, тэорыю бібліяграфіі, уплыву інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на працэсы вытворчасці, распаўсюджання і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі. Прадстаўлены матэрыял адабраны з улікам значнасці фактаў і з'яў для таго, каб адлюстраваць шляхі развіцця бібліяграфіі, яе значэнне на асобных гістарычных этапах, сувязі з іншымі грамадскімі з'явамі: бібліятэчным і інфармацыйным абслугоўваннем, кнігадрукаваннем і інш. Тэкст вучэбнага дапаможніка напісаны добрай прафесійнай мовай і будзе дапамагаць авалодваць сучаснай тэрмінасістэмай бібліяграфазнаўства на беларускай мове.

Вучэбны дапаможнік будзе карысным для студэнтаў і выкладчыкаў дадзенай дысцыпліны, а таксама сумежных («Інфармацыйная культура студэнтаў», «Гісторыя кнігі», «Бібліятэказнаўства. Гісторыя»). Прадстаўлены матэрыял уяўляе цікавасць і для выкладання іншых гуманітарных дысцыплін, асаб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліва гісторыі беларускай літаратуры, агульнагістарычных і культуралагічных.

*Ніна Ляйко, Тамара Самайлюк*


**Summary**

**History of World and National Bibliographies**. *Nina Liajko, Tamara Samajliuk*

The course book “Bibliography Science. History” describes milestones of bibliography from its emergence and development during the handwriting period of textual communications to the era of book-printing as the main method of recording and distributing of information and during the stage of implementation and development of digital communications.

Organization of bibliographic information production at every of the periods, contribution of outstanding scientists and key institutions, basic sources of general and special bibliography composing its golden fund, achievements of elaboration of bibliographic theory and methods of bibliographing and bibliographic services are reflected in the publication.

The course book material was selected on the principle of significance of facts and events reflecting the ways of bibliography development, its value during certain historical stages, and its connections with other civic services: library and information services, book-printing and book-selling. The prominent property of the course book is the generalization of the main trends of the development of world and Belarusian bibliography during the period of digital communications, which helps to contemplate prospects of bibliography application and resolve its current problems.

The course book would be interesting for students of higher and secondary educational institutions specializing in library science, lecturers and students studying library-informational and bibliological disciplines.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ